Цэна асобнага нумэру 5 кап.

# НАША НІВА

Выходзіць што тыдзень.

Адрэс рэдакціі і адміністраціі: Вільня, Завальная вуліца, д. № 7.

Цэна з перэсылкай і дастаўкай на 1 г. — 2 р. 50 к., на 6 мес. — 1 р. 25 к на 3 м. — 65 к., на 1 мес. — 25 к. За граніцай: на 1 г. — 4 р., на 6 мес. — 2 р 3 мес. — 1 р. Перамена адрэсу — 20 коп.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі Рукапісы і карэспандэнціі, прысланые у рэдакцію, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго, хто яе прысылае. Можна такжэ надпісаць проз-вішчэ разам з фаміліей, хто не захочэ, каб была надрукавана праўдзівая фамілія Адрэс і фамілія толькі для ведама рэдакціі. Рукапісы аўторам не вертаюцпа назад.

Год VIII. | 19 Ліпня 1913 г. | №. 29.

## Беларускі унівэрсытэт.

Апошнімі часамі шмат пішуць і гаворуць аб беларускім унывэрсытэці. Мы ужо пісалі аб тым, што гарады: Вільня, Мінск, Вітэбск стараюцца адзін перэд другім, каб гэты унівэрсытэт быў у іх. Найбольш-жэ стараецца „выпрасіць“ сабе той унівэрсытэт гор. Вільня. Віленскіе грамадзянскіе дзеяцелі дасталі нават пазваленьне паслаць у гэтай справі дэпутацію у Пецярбург.

Палякі, хоць і не аб іхнім унівэрсытэці гутарка ідзе, занепакоены тым, каб ён ня быў огнішчам абрусеньня. Расейскіе націоналісты баяцца чаго іншаго: яны падазрэваюць, што будучы унівэрсытэт будзе крыніцай апалячэньня.

Але ніхто не рахуецца з мейсцовым беларускім народам. Беларусы ва ўсей гэтай справе іграюць ролю, так сказаць, „пушэчнаго мяса“, ці таго мядзьведзя, не забітаго ешчэ, аб скуру катораго, дасужые паляўнічые, калісь то сварыліся.

Ва ўсю гэту справу умешаліся ешчэ і праваслаўные брацтвы ковенскай і віленскай губэрні і урадзілі, разам с саюзам «ісціна рускіх» людзей, прасіць каго трэба, каб не пазволілі аткрываць унівэрсытэту, а паслухаць іхняй рады і аткрыць у Вільні не унівэрсытэт, а праваслаўную духоўную акадэмію, з якой ні палякі, ні літвіны, ні беларусы каталікі ня маглі-бы мець ніякай карысьці.

Калі гэтай рады паслухаць, кажуць яны, можна заразʼ трох зайцоў забіць: стрымаць апалячэньне, прырыніць, на ўсякі прыпадак літвіноў і беларусоў, каторые маглі-б скарыстаць з унівэрсытэту, для свайго «сэпэратызму» а разам з гэтым змоцніць ешчэ на адну пазыцію праваслаўную веру.

Але пакуль што с поўначы, с Пецярбургу, надходзяць няпэўные чуткі. Высокіе кругі прызнаюць ешчэ перэдчасным даваць вышэйшую школу Беларусі і Літве.—І грошы німа, і чарод, як кажуць, не наш... *П. Х.*

## Наша старая слава.

Ужо у тые часы, калі пісалося «Слово о полку Ігореве», а гэта значыць у XII сталецьці, беларусы мелі умацаваўшуюся у нашых суседоў славу народу вешчуноў—знахароў. Слава гэта утрымалася за намі і па сягоньняшні дзень: кожны беларус у вачах вялікаруса, украінца, а нават літвіна, мазура і латыша гэта—вяшчун, варажбіт і знахар. Праўда, што у наш XX век, такая слава не вялікая чэсць, але факт цікавы і як усё на сьвеці мае свае прычыны. Прычыны-ж гэтые хаваюцца у характэры беларускаго народу. Як паасобные людзі, так і цэлые народы маюць свой характар, каторы адрожнівае іх, ад другіх ім падобных людзей, ці народоў. Мы беларусы, як запамятае гісторыя, былі заўсёды тым, чым і цяпер ёсць: народам лагодным, разважным і маўчлівым. Вядома, што характар вялікаруса—шырокі, размашысты, паляка — лёгкадушна-хітры, украінца—задумчыва-гуляшчы, літвіна — падазрыцельна скрытны, пры такіх суседніх характэрах, наш лагодна — разважны характар біў у вочы і змушаў кожнаго з іх аднасіцца да нас з недаверьем і нейкаго гатунку страхам, што і прыдбало нам у іхніх вачах, вышэй сказаную славу вешчуноў. Ужо Владімір сьвяты, ксціцель Русі, пабаіваецца сына свайго Ізяслава, каторы радзіўся ад полацкай княжны Рогнеды, і ешчэ нялетняго хлопчыка пастараўся пазбыцца, высылаючы яго на княжэньне у Беларусь, на дзедоўскую яго зямлю.

Аб Ізьяслававым унуку, полацкім князю Усеславе, гаварылі суседзі, што ён быў ваўкалакам, чарадзеем і пракрокам. Радзіўся бытцым ён сілай чароў, меў на патыліцы, чуць што ня месяц, а прынамсі нейкі радзімы знак, каторы даваў яму надпрыродную сілу. «Слово о полку Ігора кажэ: князь Усеслаў людзям суд даваў, князям гарады парадкаваў, а сам воўкалакам бегаў. С Кіева ён да петухоў дабегаў да Тмутаракані (каля сутоксў Дону з Азоўскім морэм). Калі у Полацку звапілі на заутрэню у Святой Софіі, то ён у Кіеві звон чуў“. А ўсё гэта пайшло с таго, што князь Усеслаў меў праўдзівы беларускі характар—быў лагодны разважны і ня ўмеў крывадушыць. Яго развага і шчырасць прыдбала яму славу надлюдзкай мудрасьці, а лагоднасць і прастата наводзілі суседзёў на думку, што ён „ня проста гэта робіць“.

І хоць баяліся гэтаго князя, хоць паважалі яго, аднак недавалі яму спакою: з усіх бакоў нападалі на яго і ён у сваім жыцьці павінен быў многа выцярпець. Такая відаць наша доля, ад князя да гарапашнаго селяніна, ад першых часоў гісторыі да нашых дзён.

За князя Усеслава мы былі дужым народам, а сіла многа значыць, голас сільнаго зычнейшы, яго уважней слухаюць і болей паважаюць. Праміпулі нашы княжые часы і беларускі народ наглядзеўся і нацярпеўся усяго; але ўсё ж астаўся такім самым: лагодным і разважным. Што цярпеў і як цярпеў, ня тут казаць аб гэтым, хто хочэ ведаць ніхай выйдзе у поле і паглядзіць на тые капцы, валатоўкі, курганы, у каторых тлеюць белые косьці і ніхай свайго сэрца папытае чые гэта косьці? за якую зямлю? за чыю волю і долю яны тут зарыты?... А калі, дарагі чытачу, тваё сэрца чыстае, не сплямлена здрадай сваей зямлі, з'добрэнай прадзедоўскай крывёй, калі не прадаў ты ешчэ сваей душы чужынцам, за лыжку стравы, ці панскую ласку — то табе тваё сэрцэ усё атважэ...

Багата наша зямелька, забытымі іменамі! Не дармо-ж такі нас суседзі лічуць за „знахароў“. не любілі мы крыві разліваць! Неспраўна, мабыць, махалі мячом; спраўней відаць цэпам, плугам і пяром рука кіравала. Прыдбалі мы німала славы чужынцам сваімі здраднікамі-прарокамі, каторые, не ў сваю хату, а з сваей хаты добро вынасілі. Але ня ўсе былі гэткіе: былі і такіе, што баранілі сваей хаты, сваей сямейкі, свайго дабра.

Усім вядома, што наш народ і зямелька у 1413 гаду, гэта значыць пяцьсот якраз гадоў таму назад, дабравольна пачала еднацца с палякамі, як „роўные з роўнымі і як вольные з вольнымі“, але ня доўга была тая роўнасць і воля—хутка мы зайшлі, праз сваю лагоднасць „як у нерад—што ні ў зад, ні ў перад“. Бо яно-ж ведама, што Пан Бог заўсёды болей цікавіўся польскімі, як нашымі справамі, а пагатовю тады, калі польскае, дэлікатна кажучы, права было дужэйшае. Вось у гэтым часе, падканец XVI сталечьця, жыў, цікавы чэлавек, каторага можэ гэтак сама лічылілі знахарам. Для нас ён цікавы тым, што шмат чаго выпракаваў наперад. Гэта Крыштоф Бронскі. Выступіў ён у абарону свайго народу, ня з мечам і самапалам у руках, ды з дружынай вольных юнакоў-сокалоў, як гэта рабілі у той час украінцы, але па беларуску, з разважным лагодным словам,—с пяром у руках. Гарачым і ясным словам хацеў ён перэканаць, каб ня крыўдзілі нас, каб далі жыць, але гэта памагло, як таму кату, каторы слухаў кухараваго казаньня закусываючы курчонкам.

«Ня ёсць Вашым мілосьцям тайна,—пісаў ён звертаючыся да польскіх паноў (і да тых паноў, аб каторых, сто гадоў пазьней, на сэйме

## „Бондароуна“.

(З народнай песьні).

I.

Не віхор калышэ лесам,
 Ні ваўкі заводзюць,
Ні разбойнікі таўпою
 За дабычай ходзюць,
На Украіне пан Патоцкі,
 Із Канёва родам,
С сваей хэўрай гаспадарэ
 Над бедным народам.
Дзе заедзе, банкетуе
 Сам ён, яго варта,
Ні старому, ні малому
 Не спускае жартаў.
Калі-ж дзе ўпадзе у вока,
 Хараство дзявечэ,—
Абнеславіць, абнячэсьціць,
 Бацьку плюне ў вочы.
Стогне змучэна Украіна,
 К небу шле праклянцьця,
Дый Патоцкаго збаўляе
 Хэўра і багацьце.
Да сягоньня жыве памяць
 Аб злым гэтым дусе
На ўсей чыста Украіне
 І на Беларусі.
У сёлах, як клялі дагэтуль,
 Так і праклінаюць,
У палацах яго толькі
 Міла ўспамінаюць.
Аб прыгожай Бандароўне
 І аб справах пана
Асталася у народзе
 Песьня з давён-даўна.

II.

У слаўным месьце Берастэчку—
 Слаўны Бондарэнко,
У яго дочка—Бондароўна,
 Пашукаць—паненка!
Хараства такога ў сьвеце
 Не было, ня будзе;
Аб ёй людзі гаварылі,
 Як аб нейкім цудзе.
Як маліны, яе губкі,
 А твар, як лілея,
Як дзьве зоркі, яе вочы,
 Гляне—сьвет ясьнее.
С плеч сплываюць яе косы,
 Якбы сонца косы,
І іскрацца, як на сонцы
 Брылянцісты росы.
Рост высокі, стан павабны
 Уся, як цень, павеўна,
Як ідзе яна, бывала,
 — На-бок каралеўна.
А сягоньня-ж выгледае
 Лепей, як заўсёды, —
У карчомцы с казакамі
 Цешыцца с свабоды.
У гульні сама рэй водзе,
 Весела міргае,
Задзіўляе усіх чыста,
 Як зара якая.
Ой, гуляй-жэ, Бандароўна,
 З вечэра да ранку,
Цябе вораг ужо сочэ,
 Сочэ на каханку.

III.

К таму часу ў Берастэчка
 К дружыне казачай
Прыблукаўся пан Патоцкі
 С хэўраю лядачай.
Як пачуў ён у карчомцы
 Зычную забаву,
Туды йдзе сваю бязчэсну
 Паказаці славу.
Банкетуе с казакамі,
 Мед, віно пье квартай,
К маладзіцам і дзеўчатам
 Лезе смольлю ў жарты.
А найгорэй к Бондароўне
 Ен прыстаў абрыдна,
Цалаваць, абняці хочэ,
 Ажно глянуць стыдна.
Асьцярожна, пан Канёўскі,
 Будзе ліха, будзе,
Не забудзься, што сумленьне
 Есьць і ў простым людзе!
Не папусьце ў крыўду славу,
 Славу ды свабоду,
Хоць і дуж ты, і багаты,
 Панскаго заводу.
Ох, патрапе народ часам
 За сябе ўступіцца,

. . . . . . . . . . . . . . .

. . . . . . . . . . . . . . .

Лезе пан да Бандароўны,
 Увесь гарыць, што ў жару;
Тая жартаў не пазнаўшы,
 Зьехала па твару.

IV.

Жутка, жутка дым пажарны
 Бухае у ночы,
А жутчэй ешчэ у пана
 Задыміліcь вочы.
Выгражае кулакамі
 Усей казачай браці:
— «Усе атказ дасьцё мне зараз —
 Дочка, бацька, маці!»
— „Асьцярожна, ясны пане,
 З грозьбамі сваімі!“.
Забурчэла старшына ўся,
 А моладзь—за імі.
Выбег с хаты пан Патоцкі
 Зваць сваю дружыну,
А старэйшы людзі вучуць
 Бедную дзяўчыну:
„Уцекай-жэ за пагодай,
 Доньна маладая,
Покі дзень засьвеце ясны,
 Покі сіл хапае,
Пан с Канёва не даруе
 Хараству тваёму,
Як ня ўмее даравaці
 Ен нідзе нікому“.
Уцекала Бондароўна
 У поле с цёплай хаты,
Абымала яе ночка,
 А вецер крылаты
Расплетаў ей косы буйны,
 Песьціў белы грудзі,—
Болей жалю меў над ёю,
 Як якіе людзі.

V.

Уцекала Бондароўна
 Ды паміж платамі,
А за ёю тры гайдукі
 З голымі шаблямі.

у Варшаві, каштэлян Мелешко казаў: «хоць нашая костка аднак сабачым мясам абрасла»). І за прошлымі скаргамі і цяперэшнім прыпомненьнем вялікай, а ня зноснай, ня толькі на маетнасьці, здароўю і учтівасці ды на сумленьню заходзячые нам зняволеньня і уціскі. А дзеля таго, што братамі нас сваімі называеця і членамі аднаго цала. аднэй рэчыпаспалітай мянуеця — просімо: ужальцеся над (намі)унісьнёнымі братамі сваімі: ніхай вас парушаць, як Вашы ўласные, раны і уразы нашы... Ніхай Вас парушыць міласць правоў Вашых, каторые у адных (пераплёпых) з нашымі (у каторых гвалт церпім). *Сцеражыцеся таго*, — засцерагаў Бронскій,—*каб тэй дзірой каторая у правах нам служачых зрабілася, і усе вашы свабоды і правы ня выслізнуліся*». Далейшая гісторыя польшчы паказала, сколькі было праўды у гэтай перэсцярозе Бронскаго. Бронскіх мы мелі многа, мелі іх ва ўсе часы нашаго жыцьця: ў час вялічыя і ў час упадку, але ніхто іхніх не знае магіл, ніхто не складаў ім гымноў. Нашых пракокоў і мучэнікоў трэба шукаць там, дзе накідана каменьня рукой тых, хто ненавідзіў іх за праўду.

Аднак-жэ, калі верыць таму, што настане на сьвеці час, калі ня сіла, а праўда панаваць будзе ў душах людзкіх, (а ня верыць гэтаму нельга), то наш многаротны беларускі народ-вяшчун прычэкае сьветлай, вялікай будучыны. Ужо, чуваць, шорах ідзе барамі-лесамі па ўсей нашай зямельцы, што настала наша пара... У вайне мечамі мы пазначылі, народны жывот свой, магіламі-курганамі, але у вайне мысьляй мы павінны пазначыць памятнікамі мысьлі і сэрца — і гэта наша дарога нам ад прыроды празначэная.

Выхадзіця-ж сяўцы мысьлі, уставайця пракокі! Хай наша старая слава народу-вешчуна, утрымаецца за намі у новай форме!

*В.*

## Да убогіх духам.

—Шчасьлівы убогіе духам...—сказаў калісь Хрыстос; і мне здаецца што калі Хрыстос казаў гэтые словы, на яго добрым абліччу зайграла балючая усьмешка. Звернуты гэтые словы, мабыць, былі не да пакорных духам селян галілейскіх і рыбакоў, а да тых фальшывых правадыроў народу, каторые любяць першые мейсцы на йгрышчах і першые лаўкі ў бажніцах; каторые растапырваюць абрамоўкі шат сваіх і распускаюць падалкі сьвітак сваіх, ды любяць, каб на рынках кланяліся ім і называлі іх:—вучыцель, вучыцель.

Гэткай шчасьлівай, бо ўбогай духам, ёсць наша, так называная, (відаць праз абмылку), інтэлігенція. Яна ня толькі любіць, але лічыць сваім правам займаць усюды першае мейсцо перад скромным селянствам, ня толькі любіць але і вымагаюць, каб ей на рынках і на дарогах кланяліся. Якім правам, зашто?! Ці затое, што сьвіткі вашы пашчыты на тандэце? Сьляпые правадыры! Вы адцэджываеця камара, а вярблюда глытаеця. Вы прыбралі цела сваё у лепшую адзежу, а душа ваша тонець у цемнаце, у грубасьці. Вы ачышчаеця кубак зверху, а у сярэдзіне ён у вас повен гнілі і бруду. Сьляпые! ачысцьця перш, што у сярэдзіне кубка, каб і тое, што з верху чыстым было. Падобны вы гробам пабеляным: зверху вы здаецёся пекнымі, а у сярэдзіне поўны брыды і гною.

Вы, навучэные ў пісьме, маглі-бы быць сьветачамі свайго народу, а сталіся лютымі воўкамі ў аўчарні. Вы, заместа аткрываць вочы братом сваім асьлепляеця іх, бо самі вы сьляпые, а і тым што бачаць закрываеця вочы.

Гады вы, племя вужачае!

Зразумейця, што гэта аб вас, казаў Добры Вучыцель: яны абегаюць морэ і зямлю каб зрабіць аднаго новаго сабе падобнаго, а як зробяць, робяць яго сынам пагібелі. Вы любіця прыкрашаць гробы пракокоў і прыбіраць нагробкі справядлівых. Дый кажэця: каб мы жылі у тые дні бацькоў нашых, то не былі-б участнікамі у крыві пракокоў. І гэтым вы самі на сябе паказываеця, што вы сыны тых, каторые пабілі пракокоў. Ці-ж вы ня робіця таго, што і бацькі вашы? Ці вы ня шырыця непраўды, глуму, здзеку над меншымі, слабейшымі братамі вашымі. Ці не забіваеця пракокоў народу свайго на славе, ці не прадаёцё, як юды бацькоўшчыны сваей, не вядзецё яе на голгофу мук, не раскрыжовываеця?!..

Гляньця на народ, на бацькоўшчыну. Чымі рукамі прыдушэн ён, чымі рукамі раскрадзена прадзедоўская слава?

Шчасьлівы убогіе духам, каторые ня чуюць і не разумеюць таго, каторые «кайданамі меняюцца, праўдаю таргуюць» і пышаюцца гэтым! Шчасьлівы убогіе духам, каторые не бачаць свайго убожэства, бруду душ сваіх і з лёгкім сэрцам могуць сабе жадаць першых мейсц і паклоноў!..

Але, памятайця, што вы сыны тых, каторые пабілі пракокоў нашых і што кроў іх ляжыць на душах вашых. Памятайця, што вы узрасьлі с крыві пабітых і с поту і змазалёў паганбленых.

*Юры Верэшчака.*

## Па Магілеушчыне.

I.

Знайшлося 3 дні вольных і я пастанавіў праехацца да свайго знаёмаго, каторы жывець у Сеннінскім павеці, Магілеўскай губ., на самым вадараздзеле Днепра і Дзвіны.—На карце гэта доўгі чатырохугольнік, адгранічэнны жалезнымі дарогамі Маладэчна—Полацак, Полацак—Вітэбск, Вітэбск—Орша, Орша—Мінск, Мінск—Маладэчна.

Такіх глухіх кавалкоў Беларусі, без чугункі ёсць колькі, найбольшы у палудзеннай Могілеўшчыне, дзе у сярэдзіне стаіць г. Чэрыкоў, і ешчэ той кавалак у сярэдзіне каторага стаіць г. Слуцак. але праз чэрыкоў і Слуцак праходзіць Маскоўска—Варшаўская Шосса; дзякуй Богу і за гэта! І гуменшчыну перарэзываець рэка Бяроза, Палесьсе маець многа вадзяных дарог і туды можна дабрацца параходамі Магілеўская і Вітэбская губерні маюць у нас найменш жалезных дарог першая 452 вярсты, а другая—701 версту

Годных для сплаву рэк Могілеўшчына маець 1000 вёрст, а Мінская каля 1000 вёрст. Вітэбшчына 800 вёрст. Цяпер можна зразумець, што самые бедные і экономічна мала развітые губэрні, гэта Могілеўшчыны і Вітэбшчына; хоць па абшару яны вялікі—роўны з Італіей.

II.

*Нешчасное палажэньне нашых беларускіх мястечак.* Вылезшы на ст. Славяны Москоўска Брэстцк. ж. д. узяў з багажа свой самакат і праз мінуту апынуўся па гразкай вуліцы, новавырасшаго пры станціі мястэчка Слаўкаго, катарае вузенкай вуліцай цiснецца да рэльсоў, дамы раскінуты ў безпарадку, як цыганскі табар, толькі дзякуючы тротуарам можна было прайсці не утапіўшыся у гразі каля крамак каторых больш, як пакупцоў, і каля аптэкарскаго магазыну, каторых цяпер у самым малым мястэчку ня менш двох.

На станцію *Славяны* сцягіваюцца тавары з велікаго раёна і мястэчка перабіваецца гэтым хлебным гандлям лесам, лёнам і т. д. Вёрст 5 трэба было праехаць дарожкай, каторая бяжыць з гары на горку паміж багатых ніў; праехаўшы млын, каля сялібы Яблонка, выехаў я на Мінскі гасцінец абсаджэны бярозамі. Ужо вечарэло калі я убачыў, каля самаго тракту белы дом маіх старых знаёмых; нашай беларускай пісьменніцы.Яе-Меці Г., не пашоў я дома, але з маладешай дружынай за гарбатай і бяседай праляцёў харошы цёплы вечэр. Да ганку, дзе мы сядзелі далетаў вячорны гоман з вёскі: каторая была відаць за рэчкай.

*М. Бобр.* На другі дзень у цені старых бяроз старога гасцінцу я на сваей сталёвай казе пракаціў 9 вёрст да мястэчка Бобр. Шэрые убогіе дамікі, рады крам на рынку, цэрква, 2 аптэкарскіе магазыны, земскі, доктар, станавы прыстаў, акушэрка, воласць. Па крамах таўклося колькі барадатых беларускіх селян (тут селяне барод ня голюць) За рэкай Бобрам на гарэ відаць праз зелень, мураваные палацы нейкаго расейскаго генерала —памешчыка; Нешчасьце Бобра, што чугунка праходзіць за вярсту, і німа станціі, а лічыцца пляцформа Бобр.“ застанаўліваюцца толькі 2 поезды, але багажу не прыймаюць; мястэчка цэлые годы просіць, каб зрабілі станцію, але каму у Расеі пікава доля нейкаго мястэчка. А мястэчка Бобр. на сплаўнай рэцэ Бобру (прыток Бярозы), адзін з старадаўнейшых гарадоў Беларусі. З стараго інвэтара м. Бобра 1573 году відаць, што у мястэчку тагды было 99 дымоў і млын па 2 колы, тагды паны запрапывалі людзей, каб толькі жылі у мястэчку, стары дакумэнт пачынаецца так: ...у ім мешчане усе нованаселенцы, каторым воля вышла на дзень сьвятога Міхала року 1572, усёж жадное платы з іх неброна, і нават не стаўлена... там жа у Бобры пустых дамоў, гдзе людзі могупь асядаць, 26... Відаць тагды стараліся засяліць мястэчкі, каб ішоў гандэль, рэмёслы, каб развівалося экономічнае жыцьцё кутка.

*М. Абчуга* ляжыць на тракце вёрст за 20 на поўнач ад Бобра, тракт абсаджэн 20-ці летнімі бярозкамі, каторые дадаюць шмат красы гэтаму шляху; якому добраму чэлавеку падзякаваць за гэтые бярозкі, мы ня ведаем.

М. Абчуга маець колькі жыдоўскіх дамоў і воласьць. Адзін жыд хацеў расшырыцх Абчугу і пастроіў дом за воласцьцю, бо у самым мястэчку ужо цесна, але паліція яго выселіла ізноў назад, лічучы ужо навасёлам, такі ёсць закон, пачаўся ён ешчэ законам 1833 г., па катораму нашым жыдам пазволена жыць толькі у мястэчках.

Каля Абчугі і далей характар краю робіцца балотны — круглые

Бегла поле і другое,
  Узбегла і на трэцьце,
Ды ўжо сілы не хапае
  Далей так ляцеці.
Ой. нешчасна Бондароўна,
  Атпачні часіну,
Памаліся за сябе ты,
  За сваю Украіну.
На сырой прыляж зямельцы,
  Атулісь касою.
Ніхай сэрцэйка дзявочэ
  Прыдзе да спакою.
Думай думкі, што чыніці
  У бядзе паганай.
Калі панскіе служакі
  Прывядуць да пана.
Не прышлося спачываці
  Доўга Бондароўне,—
Наляцела, атшукала
  Дзікая пагоня.
З дзікім сьмехам учапілісь
  За косы і рукі,
Пацягнулі нешчасьліву
  На вялікі мукі
Ночка цёмная глядзела
  Ды цямнейшай стала,
Адна зорка мігацела
  І тая прапала.

VI.

Хто галубку убароне,
  Усьцеражэ ад згубы,
Як неўбачна пападзецца
  У каршуновы дзюбы?
Вырве сэрцэйка нешчаснай,
  Выпье кроў чырвону,
Астануцца толькі косьці
  На зямельцы соннай.
Астанецца памяць толькі
  У стадзе галубіным,
Што ім выдзер хтось галубку
  Крыважадным чынам...
Прыцягнулі Бондароўну
  К пану у сьвятліцу,
Як праступніцу якую,
  Ці як чараўніцу.
Убор дзявочы абарваны,
  Зблытаные косы,
У вочках толькі рдзяцца сьлезы,
  Як у летку росы.
Ці то сьлёзы с крыўды страшнай,
  Ці з бязсільнай злосьці,
Што к чужынцу без пытання
  Прывялі у госьці.
І стаіць яна прад панам,
  Як калінка тая,
Што у лузе, над ракою
  Вецер пахіляе.
Сабірае у галоўцы
  Думанькі дзявочы,
Глядзіць сьмела, ані моргне,
  Ворагу у вочы.

VII.

Пасадзіў пан Бондароўну.
  У куце на лаве,
Якбы тую маладую
  У вясельнай славе.
Застаўляэ стол дубовы
  Сытаю ядою,
Мед, віно ў жбанах бье пенай,
  Якбы морэ тое.
Ешчэ мала: пан вяльможны
  Клікае музыкоў;
Знаць, заход вялікі робе
  Ен к гульні вялікай.
Не чэкае Бондароўна
  Тут сабе пацехі
І ня верэ панскай ласцы
  І ў панскіе ўсьмехі.
Ручкі белы заламала,
  Звесіла галоўку,
А тым часам пан Патоцкі
  Выйшаў у бакоўку.
І прыносе ён стуль стрэльбу,
  Куляй набівае,
У рукі ўзяў, і Бондароўну
  Голасна пытае:
— „Ну, што воліш сабе выбраць,
  Пышная паненка;
Ці ў бяседзе заседаці
  Вось пад гэтай сьценкай
І са мною піць, гуляці,
  Ночкі каратаці,
Ці на векі косьці парыць
  У зямельцы—маці?“

VIII.

Затраслося помстай сэрцэ
  У грудзі дзявочай,
Спахмурнелі чорны бровы,
  Заіскрылісь вочы.
Не такую, ясны пане,
  Бачыш прад сабою,
Што захоче чэсьць і славу
  Прадаваць с табою.
Сваё золота, палацы
  Астаўляй сабе ты,
Сам заморская віно пій
  І насі саеты.
Пій, гуляй с сваей раўнёю,
  Покі ваша сіла,—
Бандароўне больш да твару—
  Чымся ты—магіла.
Не прадасць яна дзявоцтва,
  Як ты, пан, сумленьня;
Твае ўгрозы ей не страшны,
  Не страшна цярпеньне.
Перад панам із Канёва
  Сьмела дзеўка стала,
Сьмела гледзэчы у вочы,
  Сьмела атказала:
— «Дужы ты с сваім багацьцем,
  А я сілы большай,—
За мной праўда і народ мой,
  За табой ліш грошы.
Чым с табою піць, гуляці,
  Ночкі каратаці,—
Лепш на векі косьці парыць
  У зямельцы—маці».

IX.

Тут як стрэліў пан Канёўскі
  У лева яе вуха,
Стала наша Бондароўна
  І нема і глуха.

вём у кішэні. За чаркай ён стаў, навучаць Пятрука: «Ты адзін кармі матку і двох сясцёр, давай ім на выпіўку, ня злуй, калі яны і сцягнуць у цябе на ласянікі, а рабіць не змушай! „Як Пятрук з гэтым ня згодзіўся, то якаў выцягнуў с с кішэні каменьчык і пачаў частаваць, ледзь той адбараніўся.

З якіх яны братоў бралі прымер, ці ні з Баўгар с Сэрбамі?.

* * *

Дажджы паднялі у Днепры ваду больш, чым на чатыры аршыны, харошые берагавые лугі, вартые на 60 руб. дзісяціна, затоплены. Калі вада сойдзе, трава будзе у ілу і сена выйдзе нездаровае ля скаціны.

*Саука Каваль.*

# Вітэбск.

### Заліва.

Нібывалая заліва здарылася гэтымі днямі у Двінску. Дождж быў так густы і буйны, што затапіло вадой вуліцы. Гэткай залівы ніхто не памятае. У сярэдзіне гораду на вуліцах можна было ездзіць на чоўнах.

# Вайна.

Карыстаючы с таго, што сэрбы і грэкі напалі на боўгароў, боўгарскае дабро расцягіваюць з усіх бакоў іх суседзі. Гэтак зрабілі добры пачатак румыны: яны захапілі вялікі абшар сумежнай з імі боўгарскай зямлі і бераг Чорнаго мора разам з рэкой Дунаем. За імі пайшлі туркі: яны адваевалі ўсю Фракію ажно да Адрыанополя, ды ўжо падступающую над Філіппополь. Гэтак боўгары трацяць ня толькі тое, што ў першай балканскай вайне здабылі сваей крывёй, але у іх адабралі і частку даўнейшай іх зямлі.

Цяпер пачалі ўжо бытцым-то мірыцца сэрбы і грэкі з боўгарамі. Памагае ім у гэтым... Румынія, тая самая Румынія, каторая сама добра пажывілася боўгарскім дабром і баіцца, каб сэрбы і грэкі, раздзяліўшы між сабой Боўгарыю, не паказалі сваіх пазуроў і румынам. Гэтымі днямі будзе відаць, ці пагодзяцца балканцы, ці далей будуць ваеваць.

А тым часам падыймаюцца над Эўропой новые хмары. Гэтые хмары, як і поўгоду таму назад, ідуць з Расеі і Аўстрыі. Расея хочэ захапіць у туркоў немалую старонку Армэнію. Аўстрыя маніцца забраць Ново-базарскій санджак, каторы сэрбы адваевалі ад туркоў. Абедзьве дзержавы даводзяць, бытцым яны гэткім нарадкам хочуць палажыць канец балканскай вайне. Але гэта толькі пустые словы.

Ва ўсей гэтай справе ёсць адна дужа цікавая рэч. Гэга—та, што ўсе кажуць, бытцым яны рупяцца на агульную карысць. Сэрбы і грэкі, пападаючы на боўгароў, даводзяць, што гэта робяць яны дзеля справедлівасьці—каб пры раздзелі заваеванай ад туркоў зямлі нікому не было крыўды. Ізноў жэ «дзеля справедлівасьці» захапілі румыны боўгарскую зямлю, кажучы, што гэта ім павінна быць заплата за тое, што яны ціха сядзелі, як балканскі хаўрус абіраў туркоў Цяпер ізноў вялікіе дзержавы маняцца урэзаць па куску зямлі у туркоў і сэрбоў за тое, што яны, нарушыўшы ўсе умовы, пачалі вайну на Балканах і ня слухаюць Эўропы.

Які будзе канец гэтай „апекі“, німа ведама. Адно толькі ходзяць гутаркі аб тым, што і самі „апекуны“ ўрэшці пасварацца і пабьюцца адзін з адным...

# З усіх старон.

### Обыскі і арэшты.

Ноччу на 13 ліпня у Пецярбурзе ахранны атдзел зрабіў многа обыскоў; і арэштоў, найболей паміж работнікамі, каторые належалі да забастовак. Обыскі рабіла ўсю ноч.

### Салдаты-баптысты.

Есць рэлігійная сэкта баптыстоў, каторым вера іх забараняе прысягаць і забіваць. Нідаўна у гор. Гайвороне (Курск. губ.) трое селян прызваных у апалчэнцы адмовілося прыймаць прысягу і ўзяць у рукі салдацкіе стрэльбы. Апалчэнцы оказаліся баптыстамі; іх атдалі пад ваенны суд.

### Бунт манахоў.

На гарэ Афоне, каторая лічыцца сьвятой гарой, бо там з непамятных часоў быў прытулак для манахоў, апошнімі часамі началіся рэлігійные сваркі, ды бунты. У гэту справу умешалося расейскае правіцельство,—яно паслаго ваенны корабель под Афонскую гару і арэштаваўты збунтаваўшыхся манахоў пасадзілі іх у карабель і прывязьлі у Одэссу. Усяго арэштаваных 616 душ манахоў. Іх маняцца разаслаць па расейскіх монастырах. 31 монах адмовілося назваць свае прозвішчы і атказываць на дапросы, іх пасадзілі у адзіночные каморкі

### „Бацька—гораду“.

У гор. Кірсанове у гарадзкого галовы, купца Свірідова, выкрылі склад крадзенаго залеза с чугунак. Гэткі самы другі склад Свірідов меў на станціі Інковка Рязанска-Уральскіх дорог. Свірідова пацягнулі над суд.

### Суд над сэмінарыстамі.

У Тыфлісі судзілі у акружным судзе вучнёў мейсцовай духоўнай сэмінарыі затое, што яны утварылі без пазваленьня начальства «Хаўрус чытаючых» і выдавалі рукапісную часопісь „Первая волна“. Некаторых сэмінарыстоў засудзілі да 2 месяцоў адседкі, ды с прычыны моніфэсту іх ад кары увольнілі.

### Забастоўкі.

У Пецярбурзе забастоўкі не спыняюцца, хоць і ня носяць масоваго характару.

У Ростове на Дону, на табачных фабрыках Асмолава і Кушнарова забаставала больш 1,000 душ. Работнікоў увальняюць. Забаставалі і друкарскіе работнікі, газэты не выходзяць.

У Тверы пачаліся забастоўкі на ткальных фабрыках.

У Двінску забаставалі грузчыкі Рыга-Орлоўскай чугункі. Прывезеные з Рыгі на іх мейсца работнікі адмовіліся стануць на работу.

Не супыняюцца забастоўкі у Рызе і у Лодзі, хоць і не маюць массоваго характару.

# Жарты.

Чатырохгадовы Стась слухае, як бацькі гавораць аб сваім вясельлі.

— Мамка пытае—а дзеля чаго я і Броніс не былі на гэтым вясельлі?

— Дурны-ж ты, як відаць,—адказвае Броніс,—мы не былі затым што нас не прасілі...

### На хаутоурах.

— Ці табе, Мікітка, ня шкода таткі, што ты скачэш?

— Я-ж скачу не па ім, а па лаві.

### С кірмашу.

— Дзе быў сусед?
— На кірмашы.
— Што рабіў?
— Каня купіў.
— А колькі даў?
— Паўсоткі.
— А дзе ён?
— Прадаў.
— За колькі?
— За 20 рублёў.
— Што-ж гэтак страціўся?
— Ат, абы сьвежая капейка!..

Рэдактар-Выдавец
А. Уласоу.

**За 4000 р.**

хачу прадаць 35 дзесяцін добрай зямлі каля возера з будынкамі і трохі лесу—асабняк

У Троцкім павеці, Суміліпскай вол., хутар Варкутаны.

Згаварыцца можна: Вільня, Лукішкі, Магометанская вул. № 8,

*Халецкі.*

# АБВЕСТКА.

За гонар сабе лічым паведаміць паважаную публіку, што

**З 20 ЛІПНЯ У ВІЛЬНІ ПА ВЯЛІКАЙ ВУЛІЦЫ № 96**

**У ДОМЕ Графа ТЫШКЕВІЧА**

**АТКРЫВАЕЦЦА**

свой агульніцкі **склад галёш** і гуміластыкавых выробоу

# Т-ва „ПРАВАДНІК“

Пры складзе на нова устроен рознічны магазын, а дзеля большай выгоды

**другі рознічны магазын па вялікай вуліцы у доме Сыркіна, на супроць почты.**

**Усесьветна вядомы гатунак нашых выробоу,**

дае змогу служыць наважанай публіцы

**толькі найлепшым таварам па доступн. цэнах.**

За сумленнасць і уважнае абслужываньне паноу пакупцоу, даем поуную заруку. Мы пакорна просім паважаную публіку ласкава звертацца да нас за пакупкамі

*Астаёмся з вялікай пашанай*

**Т-во Руска-Француснай Гуміляstыкавай, Гутапэрчэвай і Телеграфнай фабрыкі пад фармай «ПРАВАДНІК».**

Віленскі аддзел, тэлефон № 10—13 пачтовая скрынка 127.

Агульніцкі склад у Коуні, Мікалаеускі перавулак 15.

Друкарня „Артель Печатнаго Дѣла“ Віленская, 25, тэлеф. 199.